ДУ “МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ІМЯ А.С. ПУШКІНА”

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ВЕСНІК

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЗБОРНІК

## ВЫПУСК 2

МІНСК
2018

# Змест

Жыццё бібліятэк: панарама падзей ............................................. 3

*Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы* ......................... 3

*Масавыя мерапрыемствы* ......................................................... 11

Бібліятэка і час ................................................................................ 25

*Новыя эфектыўныя формы работы бібліятэк*
*ў кантэксце праграмна-праектнай дзейнасці.*
*Лазар І.А.* .......................................................................................... 25

*"Школьные годы чудесные ... как они быстро летят.*
*Каминская В.Д* ................................................................................ 33

*Астравок дзяцінства – бібліятэка. Ныpцова Т.А.* ................... 36

*Библиотечный прайм-тайм "PROСлуцк".*
*Ворончук Т.Н.* ................................................................................. 42

*Сумей создать волшебный мир в библиотеке.*
*Саенко Ю.В.* ..................................................................................... 44

*Тайна театра теней. Хилютич И.А..* ........................................ 55

*"Комсомол – моя судьба". Ждановіч С.А.* ............................... 56

# Жыццё бібліятэк: панарама падзей

## Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы

### ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

Семінар “Традыцыі і навацыі ў бібліятэчным абслугоўванні дзяцей: праблемы, пошукі, рашэнні” (на базе ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”, верасень, 2018 г.)

Школа дырэктара “Гісторыя бібліятэк Міншчыны: публічныя бібліятэкі Любанскага раёна – мінулае і шляхі наступнага развіцця” (на базе ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”, верасень, 2018 г.)

### ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”

Нарада пры дырэктары “Дзейнасць дзіцячых бібліятэк па абслугоўванні дзіцячых дашкольных устаноў, устаноў адукацыі па прафілактыцы падлеткавых шкодных залежнасцяў і асацыяльных паводзінаў” (на базе Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, ліпень, 2018 г.)

Семінар “Бібліятэчны прагрэс – у садружнасці ЦБС” (на базе Талочынскай цэнтральнай бібліятэкі, верасень 2018 г.)

### ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева”

Семінар “Эфектыўная дзейнасць бібліятэк Барысаўскага раёна па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў сярод

непаўналетніх” (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева, верасень, 2018 г.)

Круглы стол “Бяспечныя паводзіны з дарослымі” для выхаванцаў прыёмных сем’яў і дамоў сямейнага тыпу (на базе Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева сумесна з ДУА “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Барысаўскага раёна”, Барысаўскім РУУС, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік”

Практыкум “Афармленне бібліятэчнай прасторы” (на базе Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Ганны Новік, ліпень, 2018 г.).

Семінар “Прыцягнуць! Здзівіць! Утрымаць! Новая роля бібліятэк ва ўмовах скарачаемай кніжнай прасторы” (на базе Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Ганны Новік; наведванне Ерхаўскай і Куранецкай сельскіх бібліятэк, Людвіноўскай і Даўгінаўскай сельскіх інтэграваных бібліятэк, верасень, 2018 г.)

## ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”

Семінар “Край як аб’ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэчных установаў” (на базе Ашмянскай раённай бібліятэкі, ліпень, 2018 г.)

Выязны семінар: абмен вопытам работы паміж бібліятэкамі Валожынскага і Вільнюскага раёнаў (Літоўская Рэспубліка, г. Вільнюс, верасень, 2018 г.)

## ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Семінар “Бібліятэка як крыніца захавання гістарычнай памяці” (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, верасень, 2018 г.)

Творчая лабараторыя “Адкрываем Радзіму – пазнаем сябе” (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, кастрычнік, 2018 г.)

Метадычны дзень “Паспяховае планаванне – фактар эфектыўнай дзейнасці бібліятэк” (на базе ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, лістапад, 2018 г.)

## ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар “Бібліятэка – тэрыторыя чытання і выхавання дзяцей і падлеткаў” (на базе Сякерыцкай сельскай бібліятэкі, ліпень, 2018 г.)

## ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”

Гадзіна карыснай інфармацыі “Фінансавая граматнасць” (на базе Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Астрэйкі, ліпень, 2018 г.)

Інструктаж “Патрабаванні па ахове працы ў частцы праверкі ведаў кіраўнікоў структурных падраздзяленняў” (на базе Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Астрэйкі, лістапад, 2018 г.)

## ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”

Дзень інфармацыі “Бібліятэчныя фонды публічных бібліятэк Крупскага раёна: стан, улік і асаблівасці фарміравання ў сучасных умовах” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы”, жнівень, 2018 г.)

Семінар “Краязнаўчая бібліятэка як аснова захавання нацыянальнай спадчыны. Сучасны падыход да краязнаўчай работы” (на базе ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы”, кастрычнік, 2018 г.)

## Сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна

Дзень прафесійнай інфармацыі “Планаванне дзейнасці бібліятэк на 2019 год” (на базе Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, кастрычнік, 2018 г.)

Нарада “Пытанні справаздачнасці за 2018 год” (на базе Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, лістапад, 2018 г.)

## ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”

Бібліятэчны калоквіум “Майстэрства прываблівацць: бібліятэчныя акцыі і інавацыі” (на базе Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, жнівень, 2018 г.)

Семінар-практыкум “Актывізацыя працы бібліятэк па тэме малой Радзімы ў працэсе грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі” (на базе Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”

Бібліяшкола “Граніпрафесіі”: “Аднаўленне парадку ў расстаноўцы кніг і выяўленне няўважлівага стаўлення да ўліку, захаванасці і выкарыстання фондаў” (на базе Самахвалавіцкай сельскай бібліятэкі, ліпень, 2018 г.)

Савет пры дырэктары – “Бібліятэчны фонд дзіцячай літаратуры – асновы дзейнасці бібліятэкі” (на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”, верасень, 2018 г.)

## ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”

Семінар “Фонды і каталогі публічных бібліятэк: фарміраванне, улік і выкарыстанне” (на базе ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча”, жнівень, 2018 г.)

Семінар “На шляху да здароўя: дыяпазон бібліятэчных ідэй” (на базе ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча”, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”

Метадычны дзень “Прафесійнае чытанне і кампетэнтнасць бібліятэкара” (на базе ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”, кастрычнік, 2018)

Дзень прафесійных ведаў “Планаванне: пошук аптымальных варыянтаў” (на базе ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”, лістапад, 2018 )

## ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”

Семінар “Современные подходы в организации работы по ознакомлению с художественной литературой и изобразительным искусством” (на базе Слаўкаўскай сельскай бібліятэкі, жнівень, 2018 г.)

Семінар “Сельская бібліятэка – цэнтр адраджэння і развіцця культурнай спадчыны” (на базе Сноўскай сельскай бібліятэкі, лістапад, 2018 г.)

## Сетка публічных бібліятэк Пухавіцкага раёна

Псіхалагічны трэнінг “Канфлікты ў прафесійных зносінах і шляхі іх вырашэння” (на базе Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі, ліпень, 2018 г.)

Дзень загадчыка “Справаздачнасць, планаванне і прагназаванне ў бібліятэчнай дзейнасці” (на базе Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі, лістапад, 2018 г.)

## ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”

Пасяджэнне школы бібліятэчнага майстэрства “Прафесіянал”: “Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі: фарміраванне і выкарыстанне” (на базе Падлескай сельскай бібліятэкі-філіяла № 35, кастрычнік, 2018 г.)

Семінар “Чытанне як фактар выхавання грамадзяніна і патрыёта” (на базе ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”, кастрычнік, 2018 г.)

## Сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна

Дзень спецыяліста “Новы і традыцыйны падыход да арганізацыі масавых мерапрыемстваў” (на базе Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Багдановіча, верасень, 2018 г.)

Раённы семінар “Сельская бібліятэка сёння. Пошук уласнага іміджу” (на базе Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Багдановіча, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

Савет пры дырэктары “Аб дакладнасці ўліковых дадзеных у Велікарожанскай і Пагосцкай сельскіх бібліятэках” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, ліпень, 2018 г.)

Практыкум для маладога спецыяліста “Арганізацыя работы ПЦПІ раённай цэнтральнай бібліятэкі” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, жнівень, 2018 г.)

Дзень прафесійных зносін “Вопыт работы калег – у практыку нашай працы” (на базе ДУК “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” (верасень, 2018 г.)

Круглы стол “Новыя ідэі і формы папулярызацыі сучаснай дзіцячай кнігі” (на базе ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар-практыкум “Формирование здоровой нравственности через различные формы и методы библиотечной

работы” (на базе Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

Вытворчая нарада “Планаванне работы бібліятэк на 2019 год. Асноўныя напрамкі працы” (на базе ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”, снежань, 2018 г.)

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”

Семінар “Бібліятэка і краязнаўства: у кантэксце сучаснасці” (на базе Хатлянскай сельскай бібліятэкі, 23 лістапада 2018 г.)

## ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”

Нарада “Краязнаўчая дзейнасць публічных бібліятэк у рамках мерапрыемстваў да Года малой радзімы” (на базе цэнтральнай раённай бібліятэкі, кастрычнік, 2018 г.)

## ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”

Семінар “Вывучэнне патрэб на бібліятэчныя паслугі” (на базе цэнтральнай бібліятэкі г. Жодзіна, жнівень, 2018).

Псіхалагічны трэнінг “Канфліктныя сітуацыі ў бібліятэчных зносінах і шляхі іх вырашэння” (на базе цэнтральнай бібліятэкі г. Жодзіна, кастрычнік, 2018).

# Масавыя мерапрыемствы

## ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

У верасні з нагоды Дня бібліятэк супрацоўнікамі аддзела абанемента і МБА сярод чытачоў была праведзена бяспройгрышная латарэя “Читай и выигрывай”.

У верасні супрацоўнікі бібліятэкі правялі прысвечаны Дню бібліятэк флэшмоб “Как пройти в библиотеку.

У кастрычніку да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра ў аддзеле краязнаўчай літаратуры адбылася сустрэча з унучкай пісьменніка Марыяй Міхайлаўнай Міцкевіч “У доме дзеда Маўра”.

У кастрычніку ў аддзеле дзіцячага чытача адбылася мультымедыйная прэзентацыя “Милая мамочка моя”, прысвечаная Дню маці.

У кастрычніку ў аддзеле дзіцячай літаратуры ў рамках школы “Почитай-ка” адбылася літаратурная гульня “Зоосад Бориса Житкова”.

У кастрычніку ў дзіцячым аддзеле прайшло мерапрыемства для школьнікаў “Добрейший затейник из солнечного города”, прысвечанае 110-годдзю з дня нараджэння Мікалая Носава.

У лістападзе ў рамках юбілейнага года часопіса “Алеся” супрацоўнікамі залы перыядычных выданняў праведзена творчая сустрэча з аўтарам часопіса Валянцінай Быстрымовіч і прэзентацыя яе новага зборніка апавяданняў “Куда несёт водоворот”.

У лістападзе ў аддзеле замежнай літаратуры пры пры іфармацыйнай падтрымцы і супрацоўніцтве з Цэнтрам шведскіх даследаванняў у Мінску і Амбасады Швецыі ў Беларусі праведзены  Тыдзень літаратуры краін Паўночнай Еўропы.

У лістападзе аддзел краязнаўчай літаратуры сумесна з палацава-паркавым ансамблем “Станькава” і народным гісторыка-краязнаўчым аб'яднаннем “Прылуцкая спадчына” правёў лекцыю з праглядам фільма пад назвай “Жизнь – Отечеству, честь – никому”, прысвечаную 190-годдзю з дня нараджэння Эмерыка фон Гутэн-Чапскага.

У лістападзе ў аддзеле замежнай літаратуры прайшла фотавыстава “Твая Беларусь” дэбютны сумесны праект фотамастакоў Паліны Барчанінавай і Сямёна Башкірава, на якой былі прадстаўлены фотаздымкі, зробленыя ў час вандровак па славутых і адметных мясцінах Беларусі, сярод якіх Наваградак, Шчорсы, Заслаўе, Жалудок, Смаляны, Нясвіж і іншыя.

У лістападзе ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача прайшло мерапрыемства “Настольные игры в библиотеке”.

У снежні ў аддзеле замежнай літаратуры адбылася творчая сустрэча з трыа брадвейскіх выканаўцаў Нью-Ёрка, прысвечаная юбілею амерыканскага кампазітара Леанарда Бернстайна.

У снежні ў актавай зале бібліятэкі прайшла канцэртная праграма “Высоцкий. Баллада о любви ...”, у якой прымаў удзел лаўрэат міжнародных конкурсаў Аляксей Нежавец-Прывалаў.

У снежні ў рамках школы маленькага чытача "Пазнай-ка" ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача прайшлі навагоднія чытанні "Ёлочка-красавица" (па кнізе М. Аромштам "Сказка о маленькой ёлочке").

У снежні ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася творчая вечарына "Тры сшыткі", на якой прэзентаваўся трохтомнік «Выбранае» Уладзіміра Мароза.

У снежні ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача правялі перадштавагодні квэст для дзяцей 8-9гадоў "В поисках новогодних часов".

У снежні ў аддзеле краязнаўчай літаратуры адбыўся прагляд фільма "Пан Тадэвуш", прымеркаваны да 220-годдзя з дня нараджэння паэта Адама Бернарда Міцкевіча.

У снежні ў актавай зале прайшоў літаратурна-музычны вечар "В союзе звуков, чувств и душ…", рамансы рускіх кампазітараў на вершы А. С. Пушкіна.

## ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка"

У жніўні ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла тэатралізаваная прэзентацыя збора твораў С. Алексіевіч "Галасы ўтопіі".

У верасні ў скверы каля бібліятэкі ў рамках акцыі "Ад добрай кнігі – да добрага ўчынку" адбыўся вулічны тэатр "Добрая кніга".

У кастрычніку ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прэзентавалі кнігу зямлячкі Н. Бурко "Гісторыя ў лёсах" "Чужыя лёсы як свае".

## ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева”

У жніўні і кастрычніку ў рамках міжнароднага бібліятэчнага праекта “Пскоўшчына – Барысаўшчына: грані супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння” прайшлі тры вебінары. Тэмы вебінараў: “Клубы па інтарэсах – дзейсная форма работы бібліятэкі па арганізацыі вольнага часу насельніцтва”, “Імянныя бібліятэкі: праца па вывучэнні і папулярызацыі культурнай спадчыны”, “Таленавітыя супрацоўнікі ў бібліятэчнай справе”.

У верасні краязнаўчы цэнтр у рамках аб’яўленага 2018 Года малой радзімы ініцыяваў правядзенне акцыі “Створым карту малой радзімы разам!”

У мастацкай галерэі “З’ява” цэнтральнай бібліятэкі ў кастрычніку адкрыўся сумесны з барысаўскімі мастакамі штогадовы выставачны праект “Барысаўскі каларыт – 2018”, прымеркаваны да Года малой радзімы.

## ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”

У верасні ў Крывасельскай сельскай бібліятэцы, сумесна з Крывасельскім СДК і ДУ “ВТЦСАН”, адбылося свята “Неспакойныя. Захопленыя. Цікаўныя”, прысвечанае Дню пажылых людзей.

У кастрычніку ў бібліятэцы сямейнага чытання прайшло свята лепшых чытачоў “Дзень аранжавага настрою”.

У кастрычніку ў Шылавіцкай сельскай бібліятэцы адбылася святочная праграма “Матуліна сэрца”, прысвечаная Дню маці.

## ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”

У ліпені ў цэнтральнай бібліятэцы адбылося адкрыццё гарадской галерэі твораў мясцовага жывапісца Уладзіміра Сайко.

У верасні ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшло літаратурнае свята “Ён тут жыў і тварыў”, прысвечанае 210-годдзю з дня нараджэння В.І. Дуніна-Марцінкевіча.

У кастрычніку ў цэнтральнай бібліятэцы прэзентавалі новыя кнігі Аляксандра Аляксандравіча Чароміна.

## ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

У верасні ў рамках рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі “Дарога да святыняў” у ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная Дню беларускага пісьменства з удзелам намесніка старшыні Беларускага фонда культуры, пісьменніка Анатоля Бутэвіча, ганаровага кіраўніка XXV экспедыцыі Ніны Загорскай; доктара гістарычных навук, прафесара Пятра Лысенкі; доктара філалагічных навук, прафесара Сцяпана Лаўшука.

У кастрычніку ў ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” адбыліся III Пакроўскія чытанні “Живое слово мудрости духовной”, прысвечаныя Году малой радзімы.

У снежні ў ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” адбыліся 7-я Койданаўскія чытанні “Дзяржыншчына: ад мінулага да сучаснага”, прысвечаныя Году малой радзімы.

## ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”

У жніўні ў Заастравецкай сельскай бібліятэцы прайшла конкурсна-гульнёвая праграма для летніх імянііннікаў “У краіне дзяцінства”.

У кастрычніку ў Галавацкай сельскай бібліятэцы прайшла творчая сустрэча з пісьменніцай Т. Цвірка “Мілей за родныя мясціны нішто не можа ў свеце быць” і прэзентацыя яе новага зборніка “Зноў з табой я, месцейка святое!”

## ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”

У жніўні ў рамках Года малой радзімы ў літаратурным музеі К. Чорнага вёскі Цімкавічы правялі літаратурна-краязнаўчую імпрэзу да 55-годдзя земляка Алеся Бельскага “Славутыя і вядомыя людзі з нашага краю”.

У кастрычніку ў Камсамольскай сельскай бібліятэцы прайшло краязнаўчае падарожжа “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”.

У кастрычніку ў Слабадакучынскай бібліятэцы-клубе да 105-годдзя М. Рамашкі прайшла краязнаўчая гадзіна “Герой Савецкага Саюза – ураджэнец вёскі Дусаеўшчына”.

## ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”

У жніўні ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла прэзентацыя дэбютнай фотавыставы Ірыны Цыбулькінай “Родные лица”.

У кастрычніку ў Узнацкай сельскай бібліятэцы-клубе адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “Пяшчотная, мілая, добрая!”

У лістападзе ў Крупскай дзіцячай бібліятэцы адбылася конкурсна-забаўляльная праграма “Дзень аранжавага настрою”.

## Сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна

У жніўні ў межах акцыі “Лета з добрай кнігай” бібліятэкары Лагойскай дзіцячай бібліятэкі арганізавалі раённае свята “Лето, книга, дружба – вот, что детям нужно”.

У верасні ў межах Тыдня беларускага слова “Ты – думак аснова, ты – ведаў крыніца” ў Лагойскай дзіцячай бібліятэцы адбылася сустрэча “Пад знакам роднага слова” з мясцовымі пісьменнікамі В.Вярбіцкай і Н.Мядзелец.

## ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”

У ліпені Любанская раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама ў рамках Года малой Радзімы правялі раённае свята паэзіі і песні “Я словам слаўлю родны край”, прымеркаванае да 85-годдзя з часу выхаду паэмы Я. Купалы “Над ракою Арэсай”.

У верасні Любанская раённая цэнтральная бібліятэка правяла для навучэнцаў ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Любані” ўрок ведаў у рамках краязнаўчага праекта “Город, в котором я живу”, прысвечаны Году малой Радзімы.

У лістападзе Камунаўская сельская бібліятэка правяла сустрэчу моладзі з ветэранамі камсамольскага руху “Без прошлого нет будущего”, якая была прысвечана 100-годдзю УЛКСМ.

## ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”

У верасні на базе раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася творчая сустрэча з артыстамі Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек “Дзень нараджэння лялькі”.

У верасні на базе раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі Дз. Юртаева “Ні хвіліны цішыні”.

У кастрычніку ў Пятрышкаўскай сельскай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з С. Клімковічам “Загадка дэтыктыўных гісторый”.

У лістападзе ў бібліятэцы ДУ “Мінскі РЦК адбылася творчая сустрэча з І.М.Фраловай “Канікулы з добрай кнігай”.

## ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”

У ліпені на базе філіяла-музея “Фальварак Ракуцёўшчына” в. Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна была арганізавана інтэрактыўная літаратурная пляцоўка “Ізноў пабачыў я сялібы, дзе леты першыя прайшлі” ў рамках свята паэзіі і песні “Ракуцёўскае лета”.

У лістападзе супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі сумесна з культурна-асветніцкім аб'яднаннем украінцаў "Краяны" правялі святочную праграму "Фестиваль украинской культуры".

## ДУ "Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка"

У жніўні ў рамках Года малой радзімы Баярская сельская бібліятэка-дом вольнага часу правяла сустрэчу "Я песни лучшие для вас спою" з вядомым земляком, оперным спеваком з чэшскага горада Астрава Сяргеем Мечыслававічам Зубкевічам.

У лістападзе Нарацкая сельская бібліятэка арганізавала сустрэчу "Да цябе не з ціхім жалем, вёска, еду не тады, калі баліць…" з ураджэнкамі Мядзельшчыны – аглядальнікам аддзела па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алінай Грышкевіч і старшынёй аддзялення "Сяльчанка" Беларускага сюза жанчын Рэгінай Давідовіч.

## ДУК "Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы"

У верасні ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы адбыўся конкурс «Библио-леди» для самых начытаных і творчых дзяўчынак, які праходзіў у рамках Дзён горада Аўцэ ў Нясвіжы.

У верасні ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы прайшла акцыя "Библиосумерки – 2018": "Письмо из Хогвартса" – літаратурны квэст па кнігах Дж. Роўлінг "Гары Потэр".

У лістападзе ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы прайшлі фальклорныя пасядзелкі “Беларусь – Польша. Диалог культур” сумесна з раённым грамадскім аб'яднаннем “Саюз палякаў на Беларусі”.

У лістападзе ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы адбыўся раённы прафесійны конкурс “Твои таланты, библиотекарь!”

## Сетка публічных бібліятэк Пухавіцкага раёна

У жніўні Мар’інагорская гарадская бібліятэка ў рамках бібліятэчнага праекта “Маленькі патрыёт вялікай Радзімы Беларусь” правяла літаратурна-этнаграфічную гульню “Каравай зямлі і неба”.

У лістападзе бібліятэкары Рудзенскай дзіцячай бібліятэкі ў “Школе экалагічных ведаў” правялі экалагічную гадзіну “Падарожжа ў краіну зуброў”.

## ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”

У кастрычніку ў рамках святкавання Дня горада раённая цэнтральная бібліятэка запрасіла жыхароў і гасцей горада на пляцоўку бібліятэчнага прайм-тайма “PROСлуцк”.

У кастрычніку ў літаратурна-музычнай гасцінай “Алімп” Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася сустрэча-споведзь “Отдаю свой долг поэта…” з Тамарай Васільеўнай Кавальчук, Алай Эдуардаўнай Герасімавай, Мікалаем Мікалаевічам Герасімавым, паэтамі, членамі Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў.

У лістападзе ў дзіцячым аддзеле Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася сустрэча з пісьменнікам і акцёрам Валерыем Болдзіным “Мои книжки – для вас, ребятишки!”

## Сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна

У жніўні Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча сумесна з домам для самастойнага пражывання ў в. Жажэлка правяла інфармацыйную гадзіну “Малой радзіме прысвячаецца”.

У верасні ў Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Багдановіча прайшоў “Кніжны freemarket”, прысвечаны Дню бібліятэк.

У кастрычніку ў Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М.Багдановіча прайшла сустрэча “У пошуках вытокаў” з удзелам супрацоўнікаў Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння беларускага вучонага, археолага А.М. Ляўданскага.

## ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

У ліпені ў раённай цэнтральнай бібліятэцы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь арганізавалі інтэрактыўную пляцоўку “Мая зямля, мая радзіма завецца светла – Беларусь!”

У жніўні ў раённай цэнтральнай бібліятэцы ў рамках праекта “Культурны код Салігорска” да 60-годдзя з дня заснавання г. Салігорска адбылася краязнаўчая гульня “Адкрый свой горад!”

У жніўні ў раённай цэнтральнай бібліятэцы ў рамках праекта “Музычныя вечары на плошчы мастацтваў” праведзены бібліяфэст “Любімы горад гартае старонкі”.

У кастрычніку ў раённай цэнтральнай бібліятэцы ў рамках праекта “Культурны код Салігорска” прайшоў квэст “ПоИГРАем”.

## ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”

У верасні да Дня бібліятэк у раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылося традыцыйнае святочнае мерапрыемства “Ноч у бібліятэцы”, прысвечанае Году малой радзімы.

У кастрычніку раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з ДУА “Старадарожская дзіцячая школа мастацтваў” правяла святочную праграму “Самая прекрасная из женщин на Земле”.

У лістападзе ў Старадарожскай раённай цэнтральнай бібліятэцы прайшла гісторыка-літаратурная кампазіцыя “Октябрьская революция: взгляд через столетие”.

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

У кастрычніку ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла сустрэча святароў з чытачамі “Духовная книга – родник большой мудрости”.

У лістападзе ў дзіцячай бібліятэцы імя Я.Коласа ў рамках “Каласавін” прайшла літаратурная гасцёўня “Гучаць Коласавы словы”.

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”

У ліпені ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі В. Хурсіка “Vale!” з удзелам аўтара пра жыццё і дабрачынную дзейнасць Марыі Магдалены Радзівіл.

У верасні ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся юбілейны вечар да 70- годдзя пісьменніка-земляка В. Шырко “Выток натхнення – родная зямля” з удзелам літаратурнага крытыка А. Марціновіча, членаў літаратурнага аб’яднання “Нёманец”.

## ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”

У жніўні ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў вечар-сустрэча “Пясняр з салаўінай вёскі”, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Міхася Пянкрата з удзелам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіля Іванавіча Найдзіна і намесніка галоўнага рэдактара часопіса “Вожык” Аляксандра Пятровіча Каршакевіча”.

У кастрычніку ў цэнтральнай бібліятэцы адбыўся вечар “Камсамол – мой лёс”, прысвечаны 100-годдзю ВЛКСМ.

У лістападзе ў цэнтральнай бібліятэцы прайшла прэзентацыя рамана Валерыі Фамінавай “Это” з удзелам аўтара.

## ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”

У ліпені ў Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і ў Дзень горада была арганізавана святочная пляцоўка “Паляна кветак”, дзе жодзінцы і госці горада маглі прыняць удзел у інфармацыйна-пазнавальных і забаўляльных мерапрыемствах.

У жніўні ў парку культуры і адпачынку адбылося гарадское свята, прысвечанае закрыццю летняга сезона і пачатку новага навучальнага года “Падары дзіцяці радасць”.

У лістападзе ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы г. Жодзіна прайшоў IV Гарадскі фестываль песні і паэзіі з ўдзелам творчых калектываў горада.

# Бібліятэка і час

## *Новыя эфектыўныя формы работы бібліятэк ў кантэксце праграмна-праектнай дзейнасці*

Праектнае развіццё бібліятэчных устаноў – базавы інструмент інавацыйнага менеджменту. Там дзе бібліятэкі ўдумліва і творча падыходзяць да распрацоўкі праграм і праектаў, ёсць і рэальныя вынікі: больш якасныя, з прыцягненнем сучасных тэхналогій і рэсурсаў бібліятэчныя паслугі і мерапрыемствы.

Зрабіць наведванне бібліятэкі яркай падзеяй для чытача – задача не з лёгкіх. Трэба прадэманстраваць нестандартныя змест і форму працы, новыя спосабы камунікацыі, унесці характар навізны і дзейнічаць у апераджальным рэжыме. Сэнс і стыль, прафесіяналізм і крэатыўнасць – вось канцэпцыя поспеху.

Сёння хочацца спыніцца на найбольш значных і цікавых момантах дзейнасці бібліятэк Вілейскага раёна ў межах асобных праектаў.

*Праект "Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай бібліятэцы"*

У 2017 годзе распачаў сваю работу раённы бібліятэчны праект "Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай бібліятэцы".Год быў пазначаны вялікай колькасцю юбілейных дат беларускіх пісьменнікаў, мы адсвяткавалі 500-годдзе першай беларускай друкаванай кнігі. Была актывізавана работа па папулярызацыі творчасці нашых славутых пісьменнікаў. Сёння бібліятэка папулярызуе беларускую кнігу выкарыстоўваючы найбольш эфектыўныя формы:фестывалі, літаратурныя open-air,вулічныя бібліятэкі

і беларускамоўныя акцыі,бібліятэчныя падворкі, святы кнігі і інш. Менавіта такія мерапрыемствы сталі сапраўднай падзеяй, прымусілі гаварыць пра іх утранспарце, на вуліцы, у СМІ.

У маі 2017 года на адкрытай пляцоўцы ля будынка Вілейскай раённай бібліятэкі ўпершыню прайшоў літаратурны OPEN-AIR. Мерапрыемству папярэднічала шырокая рэкламная кампанія, інфармацыя была размешчана на афіцыйным сайце райвыканкама, на сайце бібліятэкі, у сацыяльных сетках і друкаваных СМІ. Галоўнай падзеяй літаратурнага OPEN-AIR стаў конкурс выразнага чытання "Галасы паэтаў Беларусі". У конкурсе прынялі ўдзел 50 аматараў беларускай паэзіі самага рознага ўзросту. На адкрытай гарадской пляцоўцы гучалі вершы беларускіх класікаў і мясцовых паэтаў. Маляўнічыя заяўкі на ўдзел у конкурсе былі размешчаны на сайце бібліятэкі і на старонцы бібліятэкі ў сацыяльнай сетцы "Вконтакте". Для арганізацыі фотазоны быў выраблены presswall, на якім размясціліся ўсе пададзеныя заяўкі.

Акрамя таго, чытачоў і ўдзельнікаў чакалі розныя гульні, віктарыны і акцыі.ЛітаратурнаяQR-акцыя "Вершы ў кішэні" знаёміла з найпрыгажэйшымі ўзорамі беларускай паэзіі ў сеціве. Удзельнікіконкурсу "Успомні верш"паказалі выдатнае веданне класічных вершаў. Усім спадабаласяінтэрактыўная гульня "Вершаваны віраж" і акцыя "Парада ад класіка". Аддзел па рабоце з дзецьмі падрыхтаваў і правёў конкурс малюнкаў "Малюем вершы", на дзіцячай пляцоўцы можна было адпачыць і прыняць удзел урозыгрышы прызоў.

У 2017 годзе ў нашым горадзе ў межах праекта "Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай

бібліятэцы” ўпершыню адбыўся літаратурна-музычны фестываль “Светлае слова”. Многа цікавых кніжных і літаратурных падзей прайшло на фестывальных пляцоўках пры падтрымцы Вілейскага раённага выканаўчага камітэта, раённага Савета дэпутатаў, у актыўным супрацоўніцтвеа з беларускім радыё, Саюзам пісьменнікаў Беларусі. На працягу месяца, пачынаючы з 8 верасня, кожны віляйчанін мог далучыцца да гэтай восеньскай культурнай падзеі. Падчас фестывалю ў бібліятэках горада, цэнтры эстэтычнага выхавання, установах адукацыі і на базе Дома духоўнай асветы працавала 27 інтэрактыўных пляцовак, усе мерапрыемствы наведалі больш за паўтары тысячы чалавек, а ў конкурсах мастацкага чытання і аўтарскай песні прынялі ўдзел больш за сорак юнакоў і дзяўчат. У рамках фестывалю адбылася і дабрачынная акцыя – збіралі сродкі на лячэнне маленькага віляйчаніна Мікіты Ляшкевіча. Асабліва святочным атрымаўся літаратурны кірмаш “З кнігай праз стагоддзі!”, прымеркаваны да 500-годдзя першай беларускай друкаванай кнігі. Вілейская раённая бібліятэка сустракала гасцей выдатнымі выставамі, прысвечанымі кнігадрукаванню, старым рэдкім выданням і сучаснай беларускай кнізе. У залах бібліятэкі размясціліся пляцоўкі для літаратурных сустрэч, прэзентацый, акцый і майстар-класаў.

У гэтым годзе праект “Беларуская нацыянальная літаратурная спадчына ў сучаснай бібліятэцы” атрымаў свой працяг. Самым значным мерапрыемствам стаў літаратурны OPEN-AIR “Гісторыя і сучаснасць”, які быў арганізаваны 2 ліпеня ў гарадскім парку. Вілейская раённая бібліятэка падрыхтавала для чытачоў кніжныя выставы “Кніга яднае Беларусь!”, “Каб неба мірнае – навек!”, “Вілейскі край – для

талентаў рай!”, “Край, адкуль мы родам”, “Я кнігай адчыняю свет прыроды” і шматлікія інтэрактыўныя пляцошкі для дзіцячага і сямейнага адпачынку, якія працавалі ў рэжыме нон-стоп. Асаблівай папулярнасцю карысталася фотазона “Прымерым казку на сябе”. Падвясная выстава тантамарэсак (стэнд для фотаздымка з адтулінай для твару) прыцягвала дзяцей і дарослых магчымасцямі фотаздымкі у ролі розных казачных герояў. На творчай пляцоўцы “Кардмэкінг на траве” дзеці разам з бацькамі прынялі ўдзел у майстар-класе па вырабе паштовак, з задавальненнем рабілі паштоўкі з часопісных выразак – слоў, літар, вершаў, малюнкаў. Цікавасць і шмат пытанняў выклікала пляцоўка “Сторысек”, дзе размясціліся палатняныя торбачкі з ілюстраванымі дзіцячымі кнігамі і дадатковымі матэрыяламі. Дапаўнялі мастацкую кнігу мяккія цацкі, навукова-папулярныя кнігі па тэме, аўдыёкасеты або кампакт-дыскі, моўныя гульні, шпаргалкі для бацькоў. Дзеці з цікавасцю адкрывалі мяшэчак за мяшэчкам, чыталі кнігі, гулялі з героямі дзіцячых казак. Аматараў чытання дзіцячых часопісаў сустрэла пляцоўка радаснага чытання “Вось дык вось! Які часопіс!” Спадабалася дзецям і сумесная праца на пляцоўцы “Бібліятэчнае сонейка”. Самыя маленькія аматары чытання пакінулі на праменьчыках бібліятэчнага сонца свае далонькі з імёнамі і прозвішчамі. Гульнявая зона “Joy-park” запрашала аматараў розных гульняў. Акрамя звыклых для нас шашак, шахмат і лато, удзельнікам было прапанавана згуляць у бібліятэчны твістэр. Твістэр – падлогавая (наземная) гульня, дзе ўдзельнікі перастаўляюць пачаргова руку ці нагу на названае новае поле, не адрываючы іншыя канечнасці і захоўваючы пры

гэтым раўнавагу. Разнавіднасцю з'яўляецца бібліятэчны твістэр, дзе ў колы ўпісваюцца літаратурныя жанры, назвы, эпохі, імёны.

З паэтычнай спадчынай Вілейшчыны дарослых і моладзь пазнаёміла QR-акцыя “Вершы ў кішэні. Вілейка”. З дапамогай адмысловай праграмы для счытвання QR-кода на мабільных тэлефонах, жадаючыя змаглі прачытаць вершы паэтаў Вілейшчыны, размешчаныя на сайце нашай бібліятэкі.

Творчая пляцоўка “Свабодны мікрафон. VілейкаWordFest” з-за кепскага надвор’я размясцілася ў будынку раённай бібліятэкі. Гэта сустрэча –агульная імправізацыя, якая аб'ядноўвае крэатыўных і неабыякавых людзей, гатовых падзяліцца сваёй творчасцю з іншымі, і ствараецца сумеснымі намаганнямі на вачах саміх удзельнікаў. Да вольнага мікрафона падыходзілі вядомыя людзі Вілейшчыны, сярод якіх Кажура В. В. і Цанунін У. Я. Прыйшлі і частыя госці бібліятэкі, члены літаратурнай гасцёўні “Дамінанта душы”. Прыемна было бачыць навучэнцаў і выпускнікоў школ горада і іх бацькоў. Госцяй вольнага мікрафона была самадзейная група народных спеваў “Скарбонка” з аграгарадка Любань.

*Бібліятэчны віртуальны фотапраект “Малая радзіма на старых фотаздымках”*

Яшчэ адзін праект, пра які хочацца расказаць, пачаў сваю працу ў гэтым годзе. У Беларусі з’яўляецца ўсё больш людзей, якія цікавяцца гісторыяй сваёй сям’і, вуліцы, вёскі. Краязнаўства сёння перажывае новы этап развіцця. Бібліятэкі маюць багаты вопыт працы ў гэтай галіне. Іх задачы ў краязнаўчым напрамку суадносныя з задачамі музеяў і архіваў. Няма сумневу: бібліятэкам неабходна акумуляваць і захоўваць

у сваіх фондах крыніцы краязнаўчай інфармацыі, весці даследчую працу і актыўна стымуляваць цікавасць чытачоў да краязнаўства. Асаблівую актуальнасць гэта тэма набывае ў Год малой радзімы. Вывучэнню гісторыі родных мясцін прысвечаны новы бібліятэчны віртуальны фотапраект “Малая радзіма на старых фотаздымках”. Ідзе час, змяняюцца пакаленні, а Радзіма застаецца. Яна з’яўляецца тым месцам, якое аб’ядноўвае людзей розных эпох. Якія яны – нашы землякі? Даведацца пра гэта і дапамагае фотапраект.Мэта праекта – стварыць віртуальны архіў старых фотаздымкаў, якія б адлюстроўвалі цікавыя падзеі жыцця раёна, знаёмілі з нашымі землякамі,
з бытам, вольным часам, інтарэсамі людзей мінулых гадоў, у раздзеле“Малая радзіма на старых фотаздымках”на сайце ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік” (http://villib.by). Ініцыятарам праекта выступіў аддзел бібліятэчнага маркетынгу, да ўдзелу былі запрошаны карыстальнікі бібліятэк і людзі, неабыякавыя да гісторыі роднага Вілейскага краю. Яны падзяліліся з намі здымкамі розных часоў з сямейных альбомаў.

А пачынаўся праект з цікавага фотаздымка, які пабываў у капсуле часу…

У 1972 годзе на тэлевізійных экранах упершыню з'явіліся перадачы цыкла“Ад усёй душы”. Адрасаваныя яны былі самай шырокай аўдыторыі – ад школьнікаў да людзей сталага ўзросту. У 1974 годзе тэлевізійную здымачную групу праграмы сустракалі і ў беларускім саўгасе “Любань” імя 50-годдзя СССР Вілейскага раёна.Менавіта тады і быў зроблены фотаздымак: моладзь вёскі Любань на прыступках ганка Дома

культуры.Капсулу з фатаграфіяй вядучая праграмы “Ад усёй душы” Валянціна Міхайлаўна Лявонцьева прапанавала закласці ў адну з калон залы Дома культуры і дастаць праз 30 гадоў.Так і было зроблена… Важна адзначыць, што на адваротным баку фатаграфіі напісана: “Будем верны земле, на которой родились и выросли! 27 октября 1974 года”.

За час існавання праекта “Малая радзіма на старых фотаздымках” карыстальнікі пазнаёміліся з першымі харавымі калектывамі вёсак Любань, Куранец і Нарач, даведаліся, як святкавалі Дзень Перамогі ў розных вёсках раёна ў савецкі час, як выглядалі маладыя і іх госці на вяселлях 50-х гадоў. На здымках аддзяленне сувязі ў вёсцы Куранец 1959 года і піянерскі лагер “Лясная казка” 1970-ых гадоў. 100-годдзю камсамола была прысвечана публікацыя здымкаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў, у якіх давялося папрацаваць нашым землякам.

Праект абудзіў цікавасць шырокага кола карыстальнікаў, таму праца над ім будзе працягнута.

*Бібліятэчная праграма для дзяцей і падлеткаў “Здаровы лад жыцця – гэта норма”*

Прапаганда здаровага ладу жыцця, інфармаванне аб тым, колькі цікавых і карысных заняткаў можна знайсці ў сучасным жыцці, пошук новых форм бібліятэчных мерапрыемстваў, накіраваных на максімальнае запаўненне вольнага часу дзяцей і падлеткаў, – такім бачыцца нам найбольш эфектыўны шлях працы па бібліятэчнай праграме “Здаровы лад жыцця – гэта норма”. У межах гэтай праграмы ў чэрвені 2017 года ўпершыню прайшла незвычайная гульня – фотакросінг “Маладосць! Лета! Вілейка!”, арганізатарам якой выступіў аддзел бібліятэчнага

маркетынгу, а актыўны ўдзел прынялі навучэнцы УА “Вілейскі дзяржаўны каледж”. Мэты гульні – актыўны адпачынак, выпрацоўка навыкаў каманднай працы і вырашэння нестандартных задач, развіццё крэатыўнасці і рэалізацыя творчага патэнцыялу ўдзельнікаў. Фотакросінг – спаборніцтва на хуткасць і арыгінальнасць здымкаў. У Вілейскім гарадскім парку тры каманды з крэатыўнымі назвамі “Апельсін”, “Будзільнік” і “Шпількі” прайшлі два этапы гульні. Сутнасць конкурсу “Самы хуткі фатограф” заключалася ў тым, каб як мага хутчэй знайсці і сфатаграфаваць прадмет або жывую істоту з прыкметай, якая пазначана на картцы. Фатаграфаваць трэба было так, каб картка з прыкметай абавязкова трапіла ў кадр. Пасля дэманстрацыі лічбавага варыянта фатаграфіі членам журы  каманда атрымлівала чарговую картку-заданне. Арганізатары гульні мелі права папрасіць каманду зрабіць здымак паўторна, калі ён не адпавядаў тэме задання. Вынікі першага этапу гульні былі падведзены адразу пасля яго заканчэння. Другі этап гульні – конкурс “Самы крэатыўны фатограф”. Удзельнікі на працягу 30 хвілін у парку горада павінны былі зрабіць здымкі на тэмы: “Чытаць можна ўсюды!”, “Маладосць! Лета! Вілейка!” і інш. На кожную тэму па здымку. Каб вызначыць пераможцу, было праведзена інтэрактыўнае галасаванне ў групе “Бібліятэкі Вілейшчыны” ў сацыяльнай сетцы “ВКонтакте”. У галасаванні прынялі ўдзел 709 чалавек.

Фотакросінгі “Маладосць! Лета! Вілейка!” у парку нашага горада былі арганізаваны і для дзяцей са школьных аздараўленчых лагераў супрацоўнікамі аддзела раённай бібліятэкі па рабоце з дзецьмі. У чэрвені 2017 года ў мерапрыемствах прынялі ўдзел 187 школьнікаў (49 з іх

знаходзіліся на розных відах уліку). Марафон дзіцячых летніх фотакросінгаў быў прадоўжаны і ў чэрвені 2018 года. Усяго было праведзена пяць гульняў-фотакросінгаў “К здоровью с книгой!”, у якіх прынялі ўдзел 98 чалавек (з іх 14 чалавек знаходзіліся на розных відах уліку).

Кожны праект, незалежна ад таго, паспяховы ён ці не, дазваляе камандзе, якая працуе над яго рэалізацыяй, атрымаць унікальны вопыт. Поспех праекта складаецца ў набыцці камандай і арганізацыяй пэўнага досведу – уменняў, навыкаў, якія ў наступны раз можна будзе ўжыць для паўтарэння поспеху. Аналіз, прагназаванне, праца ў апераджальным рэжыме павінны быць штодзённымі і мэтанакіраванымі, толькі тады ёсць шанс не згубіцца на прасторах глабалізацыі, забяспечыць якасць паслуг і ўдасканаліць мадэль сучаснай бібліятэкі.

*Лазар І.А.,*
*заг. аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*ДУК “Вілейская раённая цэнтральная*
*бібліятэка імя Ганны Новік”*

## ***“Школьные годы чудесные … как они быстро летят”***

*(интерактивная выставка-инсталляция)*

Интерактивные выставки-инсталляции сегодня пользуются особой популярностью и наиболее востребованы как инновационная форма библиотечной работы. Они дают посетителям возможность увидеть представляемое, услышать об увиденном, а самое главное – самим стать соучастником выставки.

Одна из последних таких выставок “Школьные годы чудесные… как они быстро летят” была организована в Копыльской детской библиотеке ко Дню учителя.

Экспонаты выставки – книги разных лет о школе, близкие детям разных поколений “Митя Малеев в школе и дома”, “В стране невыученных уроков”, “Зимний дуб”, “Тринадцатый подвиг Геракла”, “Исследователи”, “Уроки французского”, а также современная детская литература о школьных буднях и предметы “школьной жизни” с историей в 10, 20, 30, 40 и 45 лет, стали связующими элементами выставки.

Знакомство с выставкой начиналось рассказом о школьной форме (экспонировались форменные платья с фартуками в повседневном и праздничном вариантах). У сегодняшних пионеров неподдельный интерес вызвали представленные на выставке значки, пилотки, горн, барабан, галстуки из советского прошлого пионерии.

